Камарова Адэліна,
вучаніца 6 «Б» класа
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа №2 г. Новалукомля
імя Ф.Ф.Азміцеля»
Чашніцкі раён
Віцебская вобласць

# «Родны сэрцу куточак»

На поўначы Беларусі ў самым сэрцы Чашніцкага раёна стаіўся маленькі горад, які займае вялікае месца ў маім сэрцы. Новалукомль... Калі я чую гэтае слова, на душы становіцца цёпла і прыемна. Гэта мой горад! Месца, дзе я нарадзілася, жыву, дзе адчуваю сябе камфортна і ў бяспецы.

У Беларусі шмат цікавых і па-свойму прыгожых гарадоў, мястэчак і вёсачак, але горад Новалукомль для мяне самы незвычайны. Кожны куточак у маім горадзе вабіць сваёй прыгажосцю і спакоем. Больш за ўсё мне падабаецца горад летам. Я люблю гуляць па яго ўтульных вулачках, асабліва па вуліцы Набярэжнай. У ясным небе ярка свеціць сонейка. Яго праменьчыкі прабіваюцца праз густое лісце дрэў, што шырока раскінулі свае галіны па ўсёй вуліцы. Цёплае паветра лашчыць твар, прыемна пахне травой і кветкамі. Дзесьці ў вышыні спяваюць птушкі, а над клумбамі гудуць працавітыя пчолкі. У канцы вуліцы ёсць лесвіца, якая спускаецца ўніз і вядзе да шырокага маста. Калі пяройдзеш яго, перад вачыма раскінецца вялікае і прыгожае возера. Слязою з неба ззяе яно ў сонечным бляску. Яго немагчыма не палюбіць! У сонечны дзень возера іскрыцца то срэбрам, то пазалотай. А якім таямнічым выглядае яно ў ціхі вячэрні час. Я ўпэўненна, што, калі ў гэты момант прыслухацца, можна пачуць незвычайныя гісторыі, якія расказваць хвалі, набягаючы адна на адну. Гісторыі пра чароўнага цмока, які жыў калісьці на беразе Лукомскага возера, пра дзяўчыну-прыгажуню, у якую ён быў закаханы, пра паходжанне назвы майго горада. Не толькі жыхары Беларусі, але і людзі з іншых краін прыязджаюць, каб палюбавацца на прыгажосць нашага возера, адпачыць на яго берагах ад мітусні і шуму вялікіх гарадоў. На адным з яго берагоў стаіць наш гонар – Лукомльская ДРЭС. Яе нездарма называюць флагманам айчыннай энергетыкі. Наша электрастанцыя – самая магутная ў рэспубліцы.

Але мой горад – гэта не толькі возера, не толькі вуліцы, не толькі дамы. Усё гэта я вельмі люблю, але мой горад – гэта і нешта іншае. Мой горад – гэта асаблівая атмасфера, якую ствараюць людзі, якія жывуць у ім. Людзі добрыя, спагадлівыя, ветлівыя, гатовыя заўсёды прыйсці табе на дапамогу. Іх добразычлівасць адчуваюць усе, хто прыязджае ў Новалукомль. Ты ідзеш па вуліцы, а жыхары горада лагодна табе ўсміхаюцца. І самае галоўнае, што ўсе мы сябруем паміж сабой, падтрымліваем адзін аднаго і дапамагаем, калі патрэбна. Мы разам перажываем і радасныя падзеі, і непрыемнасці. Кожнае свята,

фестываль, канцэрт у маім горадзе праходзяць вельмі весела і цікава. Людзі спяваюць, ладзяць гульні, з усіх бакоў чуецца смех і радасная гаворка. Я магу смела сказаць, што ў маім горадзе жывуць самыя лагодныя, чулыя і спагадлівыя людзі. Людзі, якія рабілі і робяць усё, каб наш горад быў самым лепшым, самым прыгожым.

Я вельмі люблю падарожнічаць, адкрываць новыя мясціны, знаёміцца з цівавымі людзьмі, бо па натуры я вельмі цікаўны чалавек, мне патрэбна шмат уражанняў. Але якія б месцы не наведала, якімі б цікавымі ні былі б мае падарожжы, толькі ў родным горадзе я адчуваю сябе па-сапраўднаму шчаслівай. І хоць мне ўсяго дванаццаць гадоў, але я з упэўненнасцю магу сказаць, што нішто ніколі не заменіць мне гэты родны сэрцу куточак, часцінку маёй радзі мы – мой любімы Новалукомль.